Беларусь.info

№70 09/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**У Горках раённы суд пакараў штрафам на 600 тысяч рублёў прадпрымальніка й лідэра суполкі сацыял-дэмакратаў Дзям'яна Франкоўскага.** Падчас праверкі ягонага гандлёвага пункту падатковай інспэкцыяй знайшлі не аформлены згодна з заканадаўствам адзін асобнік газэты "Народная Воля". Дзям'ян Франкоўскі кажа, што інспэктары пакінулі без увагі ягоныя тлумачэньні, што газэта распаўсюджваецца задарма.

**Арыштаваныя маёмасьць і бібліятэка Саюзу беларускіх пісьменьнікаў**. Сёньня ў першай палове дня судовыя выканаўцы пачалі апісваць маёмасьць Саюзу беларускіх пісьменьнікаў у будынку на вуліцы Фрунзэ, 5. Як паведамляла Радыё Свабода, 2 сакавіка Гаспадарчы суд Менску задаволіў пазоў галоўнага гаспадарчага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта — цяпер кіраўніцтва Саюзу мусіць пакінуць Дом літаратара й сплаціць 55 мільёнаў рублёў за арэнду.

# Факты

**"Газпрам" упершыню афіцыйна пацвердзіў, што накіраваў Беларусі кантракт на пастаўку газу ў 2007 годзе з указаннем базавага кошту ў памеры 200 долараў за тысячу кубаметраў.** Аб гэтым піша расійская газета "Коммерсантъ". Аўтарытэтнаму выданню сталі вядомыя падрабязнасці перамоваў паміж "Газпрамам" і "Белтрансгазам". Як паведаміла крыніца газеты, чарговы раунд перамоваў апынуўся безвыніковым і, больш таго, дадаў нямала новых раздражняльнікаў у адносіны Мінска з Масквой. Павелічэнне кошту на газ нават да 100 долараў, па падліках экспертаў, прывядзе да спаду беларускай эканомікі — частка стратных прадпрыемстваў узрасце да 50%, інфляцыя павысіцца да 18%, у бюджэце з'явіцца дэфіцыт да 8%.

# Людзі

**Адвакат А.Казуліна: сьледчыя трымаліся толькі вэрсіі "алмазаўцаў".** Неаб'ектыўнай і няпоўнай назваў Ігар Рынкевіч справу Аляксандра Казуліна пасьля таго, як адвакаты цалкам зь ёю азнаёміліся.

**Аўтуховіч гаворыць, што пачне піць ваду.** Адвакат Надзея Станкевіч наведала ў турме Мікалая Аўтуховіча. Яна паведаміла яму, чым скончылася ў чацьвер судовае паседжаньне, на якім ён адсутнічаў з-за стану здароўя. Мікалая Аўтуховіча расчаравала тое, што разгляд ягонай справы прыпыняецца, і ў судзе будзе пакуль разглядацца толькі тая частка, якая датычыць ягонага калегі дырэктара фірмы "Ніка-транс" Юрыя Лявонава.

# Цытаты

**М.Статкевіч: "Кангрэс цяпер – гэта пагроза расколу.** Мы разумеем, што, калі забываць пра ўласныя памылкі і пра памылкі партнэраў, то гэтыя памылкі могуць паўтарацца. Акрамя таго, мы абмеркавалі стратэгію на будучыню."

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org

Раздрукуй і распаўсюдзь
E-mail: admin@belnews.info Старонка: http://www.belnews.info/